Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
________________ А.І.Жук
«_20_» _06_ ________ 2025 г.

Рэгістрацыйны № _УД-31-1-104/2025_/вуч.

# СУЧАСНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Вучэбная праграма
ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура)

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 050 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.М.Тычына, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Л.А.Бяссонава, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 24 сакавіка 2025 г.)

Загадчык кафедры ____________І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 5 ад 17.06 2025 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ ____________Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________Н.П.Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – выпрацоўка ведаў пра адметнасць выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, фарміраванне ў іх сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для выкарыстання сучасных тэхналогій на ўроках беларускай літаратуры і ўсвядомленага выбару эфектыўных метадаў, прыёмаў і форм выкладання слоўнага мастацтва, пошуку новых тэхналогій.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

1. раскрыць дыдактычныя і метадалагічныя асновы сучасных адукацыйных тэхналогій;
2. сфарміраваць у будучых спецыялістаў уменні спалучаць тэарэтычна і на практыцы веды, набытыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны;
3. дапамагчы студэнтам авалодаць прафесійнымі навыкамі свядомага выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках літаратуры;
4. выпрацаваць у студэнтаў навыкі самастойнага адбору аптымальных тэхналогій у залежнасці ад зместу, тыпу, віду ўрока, яго тэмы, мэт, задач і ўзроставых асаблівасцей вучняў;
5. сфарміраваць у студэнтаў уяўленні аб сутнасці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту і іх адукацыйных магчымасцях у выкладанні літаратуры;
6. падрыхтаваць студэнтаў да самастойнага, творчага выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай вучэбнай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя тэмы. У лекцыйным курсе раскрываюцца агульныя пытанні, звязаныя з адметнасцю сучасных адукацыйных тэхналогій, спецыфікай і методыкай іх выкарыстання на ўроках беларускай літаратуры, паказваюцца магчымасці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, значная ўвага надаецца адметнасці выкарыстання штучнага інтэлекту ў адукацыйным працэсе і інш. Практычныя заняткі маюць на мэце паглыбіць і ўдакладніць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя студэнтамі ў час лекцый, падрыхтаваць студэнтаў да педагагічнай і пераддыпломнай практык, далейшай самастойнай настаўніцкай дзейнасці. Практычныя заняткі арыентуюць студэнтаў на грунтоўнае вывучэнне метадычнай літаратуры, на азнаямленне з вучэбна-метадычнымі комплексамі і навукова-метадычнымі часопісамі. Пры арганізацыі заняткаў варта ўлічваць прынцыпы развіваючага

навучання, кампетэнтнаснага і асобасна-арыентаванага падыходаў да выкладання літаратуры, фактар фарміравання ў студэнтаў-філолагаў актыўнага і творчага падыходу да працэсу засваення і далейшага выкарыстання на практыцы матэрыялу вучэбнай дысцыпліны.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з другімі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» адносіцца да модулю «Метадычная падрыхтоўка» і ўваходзіць у дзяржаўны кампанент установы адукацыі для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

Вучэбная дысцыпліна «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» звязана з вучэбнай дысцыплінай «Методыка выкладання беларускай літаратуры», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і адносіцца да модуля «Метадычная падрыхтоўка», вучэбнай дысцыплінай «Педагагічныя тэхналогіі», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і адносіцца да модуля «Педагогіка і псіхалогія». Для вывучэння дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» неабходна наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і адносіцца да модуля «Агульнапрафесійныя дысцыпліны».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– метадалагічныя асновы вучэбнай дысцыпліны;

– класіфікацыю сучасных адукацыйных тэхналогій, асаблівасці традыцыйнага і інавацыйнага падыходаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу;

– сутнасць сучасных адукацыйных тэхналогій, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, штучнага інтэлекту, асаблівасці і ўмовы іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе;

– інавацыйныя тэхналогіі навучання беларускай літаратуры ва ўмовах інфарматызацыі адукацыі.

***умець:***

– прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных, вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў вучняў і канкрэтных педагагічных сітуацый;

– выкарыстоўваць разнастайныя сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, штучны інтэлект у адукацыйным працэсе вывучэння беларускай літаратуры;

– ствараць інтэрактыўныя дадаткі па беларускай літаратуры для сваёй педагагічнай дзейнасці.

***мець навыкі:***

– валодання адпаведным паняційным апаратам;

– засваення новых эфектыўных тэхналогій і адказнага прымянення іх у адукацыйным і выхаваўчым працэсе;

– стварэння інтэрактыўных дапаможнікаў і дыдактычных матэрыялаў па беларускай літаратуры і іх эфектыўнага выкарыстання ў навукова-педагагічнай дзейнасці;

– работы з адкрытымі адукацыйнымі інтэрнэт-рэсурсамі па літаратуры;

– эфектыўнага інфармацыйнага пошуку.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступных кампетэнцый:

УК 6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

БПК 1. Праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці;

БПК 5. Здзяйсняць адбор зместу, форм і сродкаў навучання і выхавання, выкарыстоўваць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

*Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца:* праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна-арыентаваная тэхналогія, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання і інш.).

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 100 гадзін, з іх 44 аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 22 гадзіны, практычныя заняткі – 22 гадзіны.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 залiковыя адзiнкi.

Прамежкавая форма атэстацыi праводзiцца ў адпаведнасцi з вучэбным планам спецыяльнасцi ў форме залiку ў V семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны

Тэарэтычныя асновы курса. «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры» як дысцыпліна педагагічнага профілю, яе сувязь з іншымі дысцыплінамі. Прадмет, змест і структура курса. Асноўныя пытанні курса. Гнасеалагічныя і аксіялагічныя асновы навучання літаратуры і яе метадалогіі.

Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі як актуальная парадыгма сучаснай адукацыі.

## Тэма 2. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: адметнасць, класіфікацыя

Асноўныя мадэлі адукацыі: традыцыйная і інавацыйная. Тэхналагічная кампетэнтнасць настаўніка як важнейшы кампанент прафесійнай кампетэнтнасці педагога і ўмова павышэння эфектыўнасці і якасці педагагічнай дзейнасці.

Тэхналізацыя як асноўная тэндэнцыя развіцця адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях. Тэхналізацыя педагагічнай дзейнасці як працэс засваення, распрацоўкі і ўкаранення настаўнікам педагагічных тэхналогій у адукацыйны працэс з мэтай павышэння эфектыўнасці і якасці навучання і выхавання, прадуктыўнасці ўзаемадзеяння педагога і навучэнцаў.

Сутнасць і адметнасці педагагічных тэхналогій (па Г.К. Селяўко). Класіфікацыі тэхналогій. Асноўныя кампаненты тэхналогіі: мэтавызначэнне; прагназаванне вынікаў; праектаванне зместу вучэбнага матэрыялу і дзейнасці настаўніка і вучняў; адбор і выкарыстанне метадаў, сродкаў і дыягнастычнага інструментарыя; вызначэнне этапаў дзейнасці; кіраванне этапамі дзейнасці; дыягностыка, ацэнка, рэфлексія вынікаў.

## Тэма 3. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку беларускай літаратуры

Выкарыстанне тэхналогіі праектнага навучання на ўроку літаратуры. Падрыхтоўка даследчых, творчых і інфармацыйных праектаў як эфектыўны сродак праверкі дамашняга задання па літаратуры. Дыферэнцыраваны падыход пры вызначэнні тэматыкі праектаў. Методыка вызначэння тэм і мэт праектаў. Асаблівасці прэзентацыі праектаў вучнямі (максімальная інфарматыўнасць, часавая абмежаванасць, спалучэнне індывідуальнага і групавога відаў дзейнасці і інш.). Структура і афармленне пашпарта праектнай працы і партфоліа. Крытэрыі ацэнкі праектаў па літаратуры.

Прымяненне тэхналогіі перспектыўных ліній у V–XI класах. Методыка вылучэння скразных ліній у праграме па беларускай літаратуры для V–XI класаў. Тыпалогія скразных тэм па літаратуры: гісторыя літаратуры

(вывучэнне твораў/творчасці класікаў), тэорыя літаратуры (літаратурныя тропы, тэорыя вершаскладання), развіццё маўлення (эцюд – эсэ – сачыненне – водзыў – рэцэнзія). Методыка падрыхтоўкі інфармацыйных апор, іх змястоўнае напаўненне. Структура інфармацыйнай карткі. Спалучэнне карткі-апоры і дадатковага матэрыялу (сачыненні, ілюстрацыі, творчыя работы).

Методыка выкарыстання педагагічных майстэрняў на ўроку беларускай літаратуры. Выкарыстанне асноўных этапаў майстэрні (індукцыя, самаканструкцыя, сацыяканструкцыя, сацыялізацыя, разрыў, рэфлексія, панэль, слова майстра, творчасць) пры вывучэнні мастацкага твора, тэарэтыка-літаратурных паняццяў і звестак па гісторыі літаратуры. Методыка вызначэння і вербальнай фармулёўкі праблемнага пытання і задання для правядзення работы па тэхналогіі. Праблемы ў ажыццяўленні работы па педагагічных майстэрнях і методыка іх вырашэння.

Выкарыстанне тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення пры вывучэнні беларускай літаратуры. Агульнае і адметнае ў выкарыстанні асноўных стадый тэхналогіі (выклік, актуалізацыя ведаў, асэнсаванне, рэфлексія) пры вывучэнні літаратуры ў V – VIII і IX – XI класах. Методыка ажыццяўлення прыёмаў тэхналогіі: праўдзівыя і няпраўдзівыя сцвярджэнні, дыяграма Вена, выклік па ключавых словах, «думай – дзяліся на пары – дзяліся думкамі», кластэр, напісанне творчых работ (эсэ, тэлеграм, інтэрв'ю), сінквейн, канцэптуальная табліца.

Методыка прымянення модульнай тэхналогіі. Рэйтынгавая ацэнка паспяховасці дзейнасці вучняў на ўроку літаратуры. Віды ўзроўняў ведаў вучняў: ніжэйшы (падзейны), павярхоўна-ацэначны (пазнавальны), сярэдні – анэстэтычны (безуважны да глыбокага бачання мастацкіх сродкаў), высокі ўзровень (асэнсаваны), вышэйшы ўзровень (асэнсавана-аналітычны), спецыфіка кожнага з іх. Методыка распрацоўкі рознаўзроўневых заданняў па літаратуры. Вопыт сучасных настаўнікаў і метадыстаў пры распрацоўцы заданняў і пытанняў пяці ўзроўняў складанасці (П. Лявонава, І. Булаўкіна, Т. Мароз і інш.). Тэхналагічная карта вывучэння модуля, яе структура і методыка напісання.

Методыка выкарыстання праблемнага навучання на ўроку літаратуры. Вызначэнне праблемы і спосабаў яе вырашэння. Правядзенне дэбатаў.ё

Методыка выкарыстання тэхналогіі «перакулены клас» (Flipped Classroom*)* на ўроку літаратуры. Спецыфіка дзейнасці настаўніка і вучняў. Перавагі і недахопы ў навучанні па тэхналогіі «перакулены клас».

## Тэма 4. Інтэрактыўныя і гульнёвыя тэхналогіі навучання

Гейміфікацыя – адзін з самых актуальных і папулярных трэндаў сучаснай адукацыі. Гульнёвая тэхналогія як састаўная частка педагагічнай тэхналогіі. Вучэбная гульня як адметны від дзейнасці і сродак навучання. Элементы займальнасці ў гульнях. Функцыі гульняў: забаўляльная, камунікатыўная,

самарэалізацыі, дыягнастычная, карэкцыі, сацыялізацыі і інш.

Класіфікацыя гульняў.

Выкарыстанне гульнёвых тэхналогій на ўроку літаратуры: дзелавыя гульні, ролевыя гульні, інтэлектуальныя гульні, «мазгавы штурм», «шэсць капялюшаў», «бумеранг», «піла», SWOT і інш.

Асаблівасці праектавання і правядзення ўрокаў на аснове гульнёвых тэхналогій.

## Тэма 5. Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе ў літаратурным навучанні. Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры

Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе: склад, структура, спецыфіка функцыянавання на сучасным этапе развіцця літаратурнай адукацыі.

Функцыянальныя магчымасці высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя для развіцця чытацкіх, камунікацыйных, літаратурна-творчых і даследчых уменняў і навыкаў вучняў. Перспектывы развіцця высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя.

Каталог інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V – XI класаў.

Нацыянальныя адукацыйныя інтэрнэт-парталы, методыка іх выкарыстання пры правядзенні ўрокаў па беларускай літаратуры.

Методыка прымянення ЭСН «Беларуская літаратура. Сусвет роднага слова» і інфармацыйнага выдання «Паэт красы і гармоніі: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891 – 1917)» на ўроках літаратуры ў V – IX класах.

Выкарыстанне магчымасцей віртуальных музеяў і сайтаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам, на ўроках літаратуры.

Прымяненне на ўроку і ў пазаўрочнай дзейнасці электронных хрэстаматый, гукавых электронных выданняў, мастацкіх электронных выданняў, аўдыякніг («Беларуская і руская літаратура. У дапамогу навучэнцам», «Колас Я. Новая зямля (паэма). На ростанях (трылогія)», «Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць: паэмы, вершы, проза, песні», «Беларускія народныя казкі», «Гарэцкі М. Дзве душы» і інш.).

Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры (ЭВ «Мастацтва ў школе: жывапіс, скульптура» і інш.).

## Тэма 6. Інфармармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на ўроку літаратуры

Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі: вызначэнне, сутнасць, гісторыя ўзнікнення і развіцця, інструментарый. Сродкі і віды інфармацыйных

тэхналогій. Нарматыўна-прававыя аспекты ўкаранення і выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе Рэспублікі Беларусь. Інфармацыйная бяспека.

Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сукупнасць метадаў, працэсаў і праграмна-тэхнічных сродкаў, інтэграваных з мэтай збору, апрацоўкі, захавання, распаўсюджвання, адлюстравання і выкарыстання інфармацыі. Асноўныя сродкі ІКТ, якія атрымалі распаўсюджванне ў сучаснай сістэме адукацыі: персанальны камп’ютар, тэлекамунікацыя, мультымедыя, мабільныя прылады і інш.

Прэзентацыі (Microsoft PowerPoint), online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.), інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў, вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (X, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка, QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі і інш.

Дыстанцыйнае навучанне. Формы і сродкі дыстанцыйнага навучання.

**Тэма 7. Выкарыстанне штучнага інтэлекту ў працэсе вывучэння беларускай літаратуры**

Штучны інтэлект: вызначэнне, сутнасць, гісторыя ўзнікнення і развіцця. Выкарыстанне нейрасеткі ў адукацыйным працэсе. Найбольш папулярныя і глабальныя чат-боты ChatGPT і Deepseek.

Падрыхтоўка канструктара ўрока, тэстаў, заданняў, схем, праверка ведання зместу твораў з дапамогай чата GPT, чат-ботаў Telegram. Стварэнне ілюстрацый, ментальных карт, схем на аснове выкарыстання Leonardo AI, Copilot. Wepik для стварэння мультымедыйных прэзентацый. Падрыхтоўка анімацыі з выкарыстаннем Minimax, Pika Labs, стварэнне кодаў з галаграмай (Talking code) і інш.

**Тэма 8. Абарона праектаў**

Абарона праектаў па беларускай літаратуры, створаных з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ
# «СУЧАСНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»
## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай літаратуры** | **22** | **22** | **56** | | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | | **8** | | | |
| | 1. Тэарэтычныя асновы курса.<br>2. Прадмет, змест і структура курса.<br>3. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі як актуальная парадыгма сучаснай адукацыі. | 2 | | 8 | Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии: пособ. для учит. / Н. И. Запрудский. – Минск, 2003. – 288 с. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6]<br>[7]<br>[12] | |
| **2.** | **Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: адметнасць, класіфікацыя** | **2** | **2** | **8** | | | |
| 2.1. | 1. Асноўныя мадэлі адукацыі: традыцыйная і інавацыйная.<br>2. Тэхналізацыя як асноўная тэндэнцыя развіцця адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях.<br>3. Сутнасць і адметнасці педагагічных тэхналогій (па Г.К. Селяўко).<br>4. Класіфікацыі тэхналогій. | 2 | | | Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии: пособ. для учит. / Н. И. Запрудский. – Минск, 2003. – 288 с. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6]<br>[7]<br>[12] | |
| 2.1.1. | Класіфікацыя сучасных адукацыйных тэхналогій<br>1. Сутнасць сучасных адукацыйных тэхналогій. | | 2 | 8 | Запрудский, Н. И. Современные | [1]<br>[2] | Рэфераты, паведамленні. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Класіфікацыя тэхналогій.<br>3. Асноўныя кампаненты тэхналогіі. | | | | школьные технологии: пособ. для учит. / Н. И. Запрудский. – Минск, 2003. – 288 с. | [4]<br>[6]<br>[7]<br>[12] | Прэзентацыі. |
| **3.** | **Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку беларускай літаратуры** | **6** | **6** | **8** | | | |
| 3.1. | 1. Выкарыстанне тэхналогіі праектнага навучання на ўроку літаратуры.<br>2. Прымяненне тэхналогіі перспектыўных ліній у V–XI класах.<br>3. Методыка выкарыстання педагагічных майстэрняў на ўроку беларускай літаратуры.<br>4. Выкарыстанне тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення пры вывучэнні беларускай літаратуры.<br>5. Методыка прымянення модульнай тэхналогіі.<br>6. Методыка выкарыстання праблемнага навучання на ўроку літаратуры.<br>7. Методыка выкарыстання тэхналогіі «перакулены клас» (Flipped Classroom*)* на ўроку літаратуры. | 6 | | | Канспекты ўрокаў.<br>Жук, О. Л. Педагогические технологии в современной теории и практике образования : учеб.-метод. комплекс для студ., получающих пед. спец. / О. Л. Жук – Минск : БГУ, 2002. – 129 с. | [1]<br>[2]<br>[5]<br>[6]<br>[7]<br>[12]<br>[14] | |
| 3.1.1. | Методыка выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку літаратуры.<br>1. Тэхналогія перспектыўных ліній, праектнае навучанне.<br>2. Модульнае навучанне.<br>3. Праблемнае навучанне.<br>4. Дальтон-план.<br>5. Педагагічныя майстэрні.<br>6. Праблемнае навучанне.<br>7. «Перакулены клас». | | 6 | 8 | Відэаўрокі настаўнікаў і студэнтаў.<br>Жук, О. Л. Педагогические технологии в современной теории и практике образования : учеб.-метод. комплекс для студ., получающих пед. спец. / О. Л. Жук – Минск : БГУ, 2002. – 129 с. | [1]<br>[2]<br>[5]<br>[6]<br>[7]<br>[12]<br>[14] | Экспрэс-апытанне.<br>Планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем сучасных адукацыйных тэхналогій. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4.** | **Інтэрактыўныя і гульнёвыя тэхналогіі навучання** | **2** | **2** | **8** | | | |
| 4.1. | 1. Гульнёвая тэхналогія як састаўная частка педагагічнай тэхналогіі.<br>2. Функцыі гульняў.<br>3. Віды гульняў.<br>4. Выкарыстанне гульнёвых тэхналогій на ўроку літаратуры. | 2 | | | Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В. У. Бухавец, С. І. Замоціна, С. У. Лявоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мінск : Сэр-Вит, 2006. – 207 с. | [1]<br>[2]<br>[8]<br>[13] | |
| 4.1.1. | Выкарыстанне літаратурных гульняў на ўроку літаратуры<br>1. Гейміфікацыя сучаснай адукацыі.<br>2. Вучэбная гульня.<br>3. Класіфікацыя гульняў.<br>4. Выкарыстанне гульнёвых тэхналогій на ўроку літаратуры: дзелавыя гульні, ролевыя гульні, інтэлектуальныя гульні, «мазгавы штурм», «шэсць капялюшаў», «бумеранг», «піла», SWOT і інш. | | 2 | 8 | Відэаўрокі настаўнікаў і студэнтаў. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В. У. Бухавец, С. І. Замоціна, С. У. Лявоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мінск : Сэр-Вит, 2006. – 207 с. | [1]<br>[2]<br>[8]<br>[13] | Планы-канспекты ўрокаў з выкарыстан-нем гульнёвых тэхналогій. Прэзентацыі. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.** | **Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе ў літаратурным навучанні. Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры** | **2** | **2** | **8** | | | |
| 5.1. | 1. Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе.<br>2. Каталог інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V – XI класаў.<br>3. Нацыянальныя адукацыйныя інтэрнэт-парталы, методыка іх выкарыстання пры правядзенні ўрокаў па беларускай літаратуры.<br>4. Выкарыстанне магчымасцей віртуальных музеяў і сайтаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам, на ўроках літаратуры.<br>5. Прымяненне на ўроку і ў пазаўрочнай дзейнасці электронных хрэстаматый, гукавых электронных выданняў, мастацкіх электронных выданняў, аўдыякніг.<br>6. Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей. | 2 | | | Инструктивно-методическое письмо «Об использовании современных информационно-коммуникацион-ных технологий в учреждениях общего среднего образования в 2024–2025 учебном году». | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[10] | |
| 5.1.1. | Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры<br>1. Функцыянальныя магчымасці высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя.<br>2. Выкарыстанне інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V–XI класаў.<br>3. Нацыянальныя адукацыйныя інтэрнэт-парталы, методыка іх выкарыстання пры правядзенні ўрокаў па беларускай літаратуры.<br>4. Методыка прымянення ЭСН, віртуальных музеяў і сайтаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам і інш. | | 2 | 8 | Инструктивно-методическое письмо «Об использовании современных информационно-коммуникационных технологий в учреждениях общего среднего образования в 2024–2025 учебном году». | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[10] | Экспрэс-апытанне. Планы-канспекты ўрокаў з выкарыстан-нем інфармацый-на-адукацыйных рэсурсаў. |
| **6.** | **Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на ўроку літаратуры** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 6.1. | 1. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ): вызначэнне, сутнасць, гісторыя ўзнікнення і развіцця, | 4 | | | Минин, А. Я. Информационные | [3]<br>[4] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | інструментарый.<br>2. Сродкі і віды інфармацыйных тэхналогій.<br>3. Нарматыўна-прававыя аспекты ўкаранення і выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе. Інфармацыйная бяспека.<br>4. Дыстанцыйнае навучанне. | | | | технологии в образовании : учеб. пособ. / А. Я. Минин. – М. : Моск. пед. гос. ун-т, 2016. – 148 с. | [9]<br>[10] | |
| 6.1.1. | Методыка выкарыстання ІКТ на ўроку літаратуры<br>1. Прэзентацыі (Microsoft PowerPoint).<br>2. Online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.).<br>3. Інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў.<br>4. Вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (X, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка.<br>5. QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі і інш.<br>5. Методыка арганізацыі дыстанцыйнага навучання. | | 4 | 8 | Минин, А. Я. Информационные технологии в образовании : учеб. пособ. / А. Я. Минин. – М. : Моск. пед. гос. ун-т, 2016. – 148 с. | [3]<br>[4]<br>[9]<br>[10] | Экспрэс-апытанне. Прэзентацыі. Планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем ІКТ. |
| **7.** | **Выкарыстанне штучнага інтэлекту ў працэсе вывучэння беларускай літаратуры** | **4** | **4** | **8** | | | |
| 7.1. | 1. Штучны інтэлект: вызначэнне, сутнасць, гісторыя ўзнікнення і развіцця.<br>2. Выкарыстанне нейрасеткі ў адукацыйным працэсе.<br>3. Найбольш папулярныя і глабальныя чат-боты ChatGPT і Deepseek.<br>4. Падрыхтоўка канструктара ўрока, тэстаў, заданняў, схем, ілюстрацый, анімацый і інш. з дапамогай штучнага інтэлекту. | 4 | | | Нейрасеткі. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[6]<br>[11]<br>[12] | |
| 7.1.1. | Штучны інтэлект пры вывучэнні літаратуры<br>1. Найбольш папулярныя і глабальныя чат-боты ChatGPT і Deepseek.<br>2. Падрыхтоўка канструктара ўрока, тэстаў, заданняў, схем, праверка ведання зместу твораў з дапамогай чата GPT, чат-ботаў Telegram.<br>3. Стварэнне ілюстрацый, ментальных карт, схем на аснове выкарыстання Leonardo AI, Copilot.<br>4. Wepik для стварэння мультымедыйных прэзентацый. | | 4 | 8 | Нейрасеткі. | [4]<br>[9]<br>[10]<br>[11] | Экспрэс-апытанне. Прэзентацыі. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Падрыхтоўка анімацыі з выкарыстаннем Minimax, Pika Labs, стварэнне кодаў з галаграмай (Talking code) і інш. | | | | | | |
| **8.** | **Абарона праектаў** | | **2** | | | | |
| | 1. Абарона праектаў па беларускай літаратуры на аснове выкарыстання ІКТ.<br>2. Абарона праектаў па беларускай літаратуры на аснове выкарыстання штучнага інтэлекту. | | 2 | | Патрабаванні да праектаў. | [4]<br>[9]<br>[10]<br>[11] | Прэзентацыі.<br>Праекты. |
| | **Усяго гадзін** | **22** | **22** | **56** | | | **Залік** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии – 3 / Н. И. Запрудский. – Минск : Сэр-Вит, 2017. – 168 с.

2. Мішчанчук, І. М. Методыка выкладання беларускай літаратуры : электрон. вучэб.-метад. комплекс / І. М. Мішчанчук, М. С. Рак // СДО Moodle / Беларус. дзярж. пед. ун-т. – URL: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 (дата звароту: 30.04.2025).

3. Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб.-метад. дапам. / В. У. Праскаловіч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2022. – 167 с.

**Дадатковая літаратура**

4. Белорусская педагогическая энциклопедия : в 2 т. / редкол.: Н. П. Баранова, А. И. Жук, Г. И. Николаенко [и др.]. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2015. – 2 т.

5. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапаможнік / В. У. Бухавец, С. І. Замоціна, С. У. Лявоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мн. : Сэр-Вит, 2006. – 207 с.

6. Даутова, О. Б. Педагогические технологии для старшей школы в условиях цифровизации современного образования : учеб.-метод. пособие для учитителей / О. Б. Даутова, О. Н. Крылова. – СПб. : КАРО, 2020. – 176 с.

7. Жук, О. Л. Педагогические технологии в современной теории и практике образования : учеб.-метод. комплекс для студентов, получающих пед. специальность / О. Л. Жук. – Минск : Бел. гос. ун-т, 2002. – 129 с.

8. Жуковіч, М. В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапам. для настаўнікаў установ, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / М. В. Жуковіч. – Мінск : Аверсэв, 2007. – 156 с.

9. Минин, А. Я. Информационные технологии в образовании : учеб. пособие / А. Я. Минин. – М. : Моск. пед. гос. ун-т, 2016. – 148 с.

10. Об использовании современных информационно-коммуникационных технологий в учреждениях общего среднего образования в 2024–2025 учебном году : инструктив.-метод. письмо М-ва образования Респ. Беларусь от 9 сент. 2024 г. // Национальный образовательный портал. – URL: https://adu.by/images/2024/09/04/imp_2024_2025_oco.pdf (дата обращения: 30.04.2025).

11. Полат, Е. С. Современные педагогические и информационные технологии в системе образования / Е. С. Полат, М. Ю. Буханкина. – М. : Академия, 2007. – 364 с.

12. Селевко, Г. К. Современные образовательные технологии : учеб. пособие / Г. К. Селевко. – М. : Нар. образование, 1998. – 256 с.

13. Сивашинская, Е. Ф. Педагогические системы и технологии : курс лекций для студентов пед. специальностей вузов / Е. Ф. Сивашинская, В. Н. Пунчик ; под общ. ред. Е. Ф. Сивашинской. – Минск : Экоперспектива, 2010. – 196 с.

14. Современные образовательные технологии : учеб. пособие для бакалавриата и магистратуры / под ред. Е. Н. Ашаниной, О. В. Васиной, С. П. Ежова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2018. – 165 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «СУЧАСНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў – развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў УА праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры,

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, прэзентацый, праектаў, напісанне планаў-канспектаў урокаў.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | Тэматыка паведамленняў |
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Мультымедыйная прэзентацыя | Прадстаўленне зместу вучэбнай задачы з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій | Тэматыка прэзентацый |
| 5. | План-канспект урока | Сродак, які выяўляе ўменні рыхтавацца да правядзення ўрокаў беларускай літаратуры | Рэкамендацыі па афармленні плана-канспекта ўрока |
| 6. | Праект | Канчатковы прадукт, які атрымліваецца ў выніку планавання і выканання комплексу вучэбных і даследчых заданняў. Дазваляе ацаніць узровень сфарміраванасці аналітычных, даследчых навыкаў, навыкаў практычнага і творчага мыслення. Можа выконвацца ў індывідуальным парадку або групай студэнтаў | Рэкамендацыі да выканання праекта |

**ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ**

**дзённая форма атрымання адукацыі**

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 1. Уводзіны | 8 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, прачытаць неабходныя метадычныя дапаможнікі, падрыхтаваць паведамленне:<br>1. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: за і супраць.<br>2. Ці заменіць настаўніка штучны інтэлект.<br>3. Як зацікавіць літаратурай вучняў-зумераў і пакаленне альфа. | Паведамленні. |
| 2. | 2.1.1. Класіфікацыя сучасных адукацыйных тэхналогій | 8 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, узнавіць веды, атрыманыя на дысцыпліне «Педагогіка». Падрыхтаваць рэфераты і паведамленні:<br>1. Традыцыйныя і інавацыйныя тэхналогіі: агульнае і адрознае.<br>2. Класіфікацыя сучасных адукацыйных тэхналогій.<br>3. Структура сучасных адукацыйных тэхналогій.<br>4. Аналіз тэхналогіі (1 на выбар студэнтаў). | Рэфераты і паведамленні. |
| 3. | 3.1.1. Методыка выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку літаратуры | 8 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, узнавіць веды, атрыманыя на дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры». Падрыхтаваць планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем сучасных адукацыйных тэхналогій. | Планы-канспекты ўрокаў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4. | 4.1.1. Выкарыстанне літаратурных гульняў на ўроку літаратуры | 8 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, узнавіць веды, атрыманыя на дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры». Падрыхтаваць планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем сучасных адукацыйных тэхналогій.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю «Методыка выкарыстання гульняў на ўроку літаратуры» (1 на выбар студэнта):<br>1) дзелавой гульні,<br>2) ролевай гульні,<br>3) інтэлектуальнай гульні,<br>4) «мазгавога штурму»,<br>5) «шасці капялюшаў»,<br>6) «бумеранга»,<br>7) «пілы»,<br>8) SWOT. | Планы-канспекты ўрокаў, прэзентацыі. |
| 5. | 5.1.1. Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры | 8 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя метадычныя дапаможнікі.<br>Падрыхтаваць планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў. | Планы-канспекты ўрокаў. |
| 6. | 6.1.1. Методыка выкарыстання ІКТ на ўроку літаратуры | 8 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць прэзентацыю па тэмах:<br>1) віды і сродкі ІКТ,<br>2) прэзентацыі (Microsoft PowerPoint),<br>3) online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.),<br>4) інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў,<br>5) вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (Twitter, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя | Прэзентацыі.<br>Планы-канспекты ўрокаў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | герояў твора ці пісьменніка,<br>6) QR-коды,<br>7) адукацыйныя Web-квэсты,<br>8) буктрэйлеры,<br>9) online-анатацыі, сэлфі.<br>Падрыхтаваць планы-канспекты ўрокаў з выкарыстаннем ІКТ. | |
| 7. | 7.1.1. Штучны інтэлект пры вывучэнні літаратуры | 8 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць прэзентацыі па тэмах:<br>1) чат-боты ChatGPT і Deepseek,<br>2) чат-боты Telegram,<br>3) Leonardo AI, Copilot, Wepik,<br>4) Minimax, Pika Labs, Talking code. | Прэзентацыі. |
| | **Усяго гадзін** | **56** | | |

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– індывідуальная гутарка са студэнтамі для выяўлення якасці ведаў матэрыялу;

– франтальнае апытанне;

– вусная праверка атрыманых ведаў;

– праверка канспектаў урокаў;

– праверка выкананых праектаў;

– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных дакладаў, рэфератаў, паведамленняў і прэзентацый.

Ацэнка за выкананне заданняў, рэфератаў, дакладаў уключае: правільнасць выканання задання; адпаведнасць і паўната раскрыцця тэмы; якасць выканання работы; самастойнасць меркаванняў; логіка падачы інфармацыі; афармленне.

Рэкамендаваная форма выніковага кантролю – залік.

**Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР**

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Рэферат / паведамленне /даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі);<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 3 заўвагі);<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (4 і больш заўваг) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па двух пунктах з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па ўсіх пунктах |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (3 і больш заўваг);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты не служаць мэтам абгрунтавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў |
| **Мультымедыйная прэзентацыя** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Падача матэрыялу (наяўнасць, дастатковасць і абгрунтаванасць графічнага афармлення: фотаздымкаў, відэаматэрыялаў, тэксту) | – падача матэрыялу поўнасцю адпавядае пазначаным параметрам;<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 2 заўвагі);<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 3 заўвагі);<br>– падача матэрыялу не адпавядае пазначаным параметрам |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| | (4 і больш заўваг) |
| **Канспект урока** | |
| Правільнасць афармлення структуры | – структура адпавядае патрабаванням;<br>– структура адпавядае патрабаванням часткова (не больш за 1 заўвагу) |
| Адпаведнасць зместу, метадаў і прыёмаў тэме | – змест адпавядае тэме;<br>– змест не адпавядае тэме (20 і меней адсоткаў) |
| **Праект** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Выразнасць, лаканічнасць фармулёвак | – фармулёўкі выразныя і лаканічныя;<br>– фармулёўкі маюць не больш за 2 заўвагі адпаведна пазначаным параметрам |
| Падача матэрыялу (наяўнасць, дастатковасць і абгрунтаванасць графічнага афармлення: фотаздымкаў, відэаматэрыялаў, тэксту) | – падача матэрыялу поўнасцю адпавядае пазначаным параметрам;<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 2 заўвагі);<br>– падача матэрыялу адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 3 заўвагі);<br>– падача матэрыялу не адпавядае пазначаным параметрам (4 і больш заўваг) |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, ДАКЛАДАЎ, РЭФЕРАТАЎ

1. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: за і супраць.
2. Ці заменіць настаўніка штучны інтэлект.
3. Як зацікавіць літаратурай вучняў-зумераў і пакаленне альфа.
4. Традыцыйныя і інавацыйныя тэхналогіі: агульнае і адрознае.
5. Класіфікацыя сучасных адукацыйных тэхналогій.
6. Структура сучасных адукацыйных тэхналогій.
7. Аналіз тэхналогіі (1 на выбар студэнтаў).
8. Методыка выкарыстання праектнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
9. Методыка выкарыстання модульнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
10. Методыка выкарыстання тэхналогіі перспектыўных ліній на ўроку літаратуры.
11. Методыка выкарыстання тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення на ўроку літаратуры.
12. Методыка выкарыстання тэхналогіі педагагічных майстэрняў на ўроку літаратуры.
13. Методыка выкарыстання тэхналогіі НЛП на ўроку літаратуры.
14. Методыка выкарыстання гульняў на ўроку літаратуры ў V–VIII класах.
15. Методыка выкарыстання гульняў на ўроку літаратуры ў IX–XI класах.
16. Методыка выкарыстання тэхналогіі «шэсць капялюшаў» на ўроку літаратуры.
17. Методыка выкарыстання тэхналогіі мазгавы штурм на ўроку літаратуры.
18. Урок-суд: за і супраць.
19. Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры.
20. Методыка выкарыстання прэзентацый (Microsoft PowerPoint) на ўроку літаратуры.
21. Методыка выкарыстання online-дошак (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.) на ўроку літаратуры.
22. Вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках ад імя герояў твора ці пісьменніка.
23. Методыка выкарыстання QR-кодаў на ўроку літаратуры.
24. Методыка выкарыстання адукацыйных Web-квэстаў на ўроку літаратуры.
25. Методыка выкарыстання буктрэйлераў, online-анатацый, сэлфі на ўроку літаратуры.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРЭЗЕНТАЦЫЙ

1. Методыка выкарыстання гульняў на ўроку літаратуры:
а) дзелавой гульні,
б) ролевай гульні,
в) інтэлектуальнай гульні,
г) «мазгавога штурму»,
д) «шасці капялюшаў»,
е) «бумеранга»,
ж) «пілы»,
з) SWOT.
2. Віды і сродкі ІКТ:
а) прэзентацыі (Microsoft PowerPoint),
б) online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.),
в) інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў,
г) вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (X, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка,
д) QR-коды,
е) адукацыйныя Web-квэсты (webquests),
ж) буктрэйлеры (англ. booktrailers).
з) online-анатацыі, сэлфі.
3. Штучны інтэлект на ўроку беларускай літаратуры:
а) чат-боты ChatGPT і Deepseek,
б) чат-боты Telegram,
в) Leonardo AI, Copilot, Wepik,
г) Minimax, Pika Labs, Talking code.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АФАРМЛЕННІ КАНСПЕКТА ЎРОКА

СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/ course/view.php?id=2097

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРАЕКТАЎ

1. Урок з выкарыстаннем сучасных адукацыйных тэхналогій (1 на выбар студэнта).
2. Інтэрактыўная дошка па манаграфічнай тэме.
3. Інтэрактыўная дошка па аглядавай тэме.
4. Інтэрактыўная дошка для вучняў V–VIII класаў.
5. Урок з выкарыстаннем ІКТ (1 на выбар студэнта).
6. Урок з выкарыстаннем штучнага інтэлекту.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: вызначэнне, структура, класіфікацыя.
2. Найбольш эфектыўныя віды сучасных адукацыйных тэхналогій на II ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення.
3. Найбольш эфектыўныя віды сучасных адукацыйных тэхналогій на III ступені літаратурнай адукацыі.
4. Методыка выкарыстання праектнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
5. Методыка выкарыстання модульнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
6. Методыка выкарыстання тэхналогіі перспектыўных ліній на ўроку літаратуры.
7. Методыка выкарыстання тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення на ўроку літаратуры.
8. Методыка выкарыстання тэхналогіі педагагічных майстэрняў на ўроку літаратуры.
9. Методыка выкарыстання Дальтон-плана на ўроку літаратуры.
10. Найбольш эфектыўныя віды гульнёвых тэхналогій на II ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення.
11. Найбольш эфектыўныя віды гульнёвых тэхналогій на III ступені літаратурнай адукацыі.
12. Методыка выкарыстання тэхналогіі «шэсць капялюшаў» на ўроку літаратуры.
13. Методыка выкарыстання тэхналогіі НЛП на ўроку літаратуры.
14. Методыка выкарыстання тэхналогіі мазгавы штурм на ўроку літаратуры.
15. Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры.
16. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на ўроку літаратуры.
17. Методыка выкарыстання прэзентацый (Microsoft PowerPoint), online-дошак (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.) на ўроку літаратуры.
18. Інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў, вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (X, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка.
19. QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі на ўроку літаратуры.
20. Методыка выкарыстання штучнага інтэлекту на ўроку літаратуры.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПА ДЗЕСЯЦІБАЛЬНАЙ ШКАЛЕ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулю;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыповыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулю;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулю;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулю і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулю;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулю;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Методыка выкладання беларускай літаратуры» | Кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Выкарыстанне літаратурных гульняў на ўроку літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Методыцы выкладання беларускай літаратуры» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |
| «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» | Кафедра інфармацыйных тэхналогій у адукацыі | Пры вывучэнні тэмы «Методыка выкарыстання ІКТ на ўроку літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Інфармацыйных тэхналогіях у адукацыі» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |
| «Педагагічныя тэхналогіі» | Кафедра педагогікі | Пры вывучэнні тэмы «Методыка выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Педагагічных тэхналогіях» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, пратакол № 8 |